**САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА**

# АБМЕРКАВАЛІ ВАЖНЫЯ ПЫТАННІ

Напрыканцы снежня адбылося чарговае пасяджэнне савета ўніверсітэта, на якім прарэктар па навуковай рабоце І.М. Прышчэпа падвяла вынікі навукова-даследчай работы нашай ВНУ за 2016 год і акрэсліла задачы на 2017 год.

Пра вынікі маніторынгу эфектыўнасці ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэце паведаміла прарэктар па выхаваўчай рабоце І.В. Бондал.

Было разгледжана пытанне і прынята станоўчае рашэнне аб хадайніцтве перад Еўразійскай асацыяцыяй універсітэтаў аб уступленні ВДУ імя П.М. Машэрава ў названую асацыяцыю.

На пасаду загадчыка кафедры экалогіі і аховы прыроды быў выбраны Г.Г. Сушко, прафесара кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры – В.А. Космач, прафесара кафедры агульнага і рускага мовазнаўства – С.У. Нікалаенка. Было прынята рашэнне аб хадайніцтве перад Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання дацэнта па спецыяльнасці «Клінічная медыцына» Г.І. Навумавай, дацэнту кафедры анатоміі і фізіялогіі.

**Г.К. СЕМЯНЬКОВА,**
вучоны сакратар
савета ўніверсітэта.